# НЯВОЛЬНІЦА

## З успамінаў Фяліцыі Адамаўны Колас, вязня канцэнтрацыйнага лагера Майданак, жыхаркі в. Курчоўцы

...У тым, ваенным 1943 г. мне не было і васемнаццаці. Лета толькі набіралася сілы, як ў вёску паступіў ад немцаў загад: моладзі такога і такога ўзросту з'явіцца ў Адэльск за пашпартамі. Сабраліся мы, курчоўскія хлопцы і дзяўчаты, пайшлі. А там моладзь з іншых вёсак. Фашысты ўсіх пад канвой - і ў Германію. Вось табе і пашпарт... Плач, крык вісіць над калонай. Чую, кажуць, і там нехта ўцёк, і там. Страляніна, брэх аўчарак. А ў галаве адна думка: «Няўжо ніколі не ўбачу больш роднага парога?». І ўцячы хачу, і баюся. І ўсё ж у Драглянах наважылася. Ускочыла ў нечыю шопку пры самай дарозе. А Божа ж мой! Дровы як пакоцяцца - трэск, ломат! Прытаілася ні жывая, ні мёртвая. Чакаю той хвіліны, калі немец дзверы адчыніць і стрэліць. Але пакрысе аддаліўся людскі гоман, сціхла страляніна. Прыцемкамі я вярнулася ў Курчоўцы. Аднак у сваю хату не іду, хаваюся па суседзях. І дзень, і другі ціха ў вёсцы. Ну, я і адважылася, прыйшла ў свае вуглы. Эх, каб ведаць, дзе ўпадзеш...

У нас адзін канец хаты няскончаны быў. Там з сястрой і хаваліся. І вось чуем крык па вёсцы: «Немцы!». Мы - уцякаць. Але позна. У хаце грукацяць ужо боты немцаў і паліцаяў. «Дзе сястра?» - крычаць брату, а самі - у гэты канец хаты. Мы з сястрой трымаем дзверы, а ногі ад страху падкошваюцца. Уварваліся, вывелі нас. На вуліцы - плач. Адна дзяўчынка прыхавалася, дык замест яе забралі маці. «Буду ўцякаць», — шэпча сястра мне. І як ірванецца па загуменні ў жыта. Паліцай з Адэльска страляў, але, мусіць, уверх. Бо каб хацеў застрэліць, то прамахнуцца не мог - усё ж адбылося на яго вачах. А ў мяне ад страху за сястру ногі прыраслі да зямлі.

Вось так я трапіла ў няволю. Пераначавалі ў Адэльску, а там пагналі нас праз Саколку на Беласток. Той шлях годам здаўся. Лета, усё навокал цвіце, жыта налівае колас. А мы з кожным крокам аддаляемся ад роднай зямлі.

У Беластоку трымалі нядоўга. Павезлі цягнікам далей. І вось мы пад Люблінам. Не разумеем, пытаем адзін у аднаго: «Што гэта за баракі? Для чаго іх гэтулькі многа?». То быў Майданак. Канцэнтрацыйны лагер. Вязні - і рускія, і яўрэі, і беларусы, і палякі, і людзі з іншых краін. Далі нам паласатае адзенне. На грудзях злева ў мяне быў знак «Р» - полька, значыць. І так кожны вязень памячаўся.

Як там было ў тым лагеры? З нашага сельсавета нядаўна дзяўчаты неяк на экскурсію трапілі ў Майданак. Вярнуліся страшна ўражаныя і

пытаюцца: «Няўжо, цётка Фяліцыя, вы былі там? Гэта ж такі жах!» Жах, дзеткі. А куды падзенешся? Пад прыцэлам зброі і дзень, і ноч. У прыбіральню ідзеш таксама пад карабінам. Барак вялікі. Скрозь запоўнены жалезнымі лежакамі ў некалькі ярусаў. Мучыў холад. Але найгорай - голад. Людзі елі нават лісце. Нам, маладым дзяўчатам, было крыху лягчэй. Бо калі-нікалі ганялі працаваць на кухню, мыць падлогу ў ахоўнікаў. То хоць і пільнавалі, а ўсё роўна хлеба які кавалачак падбярэш ці што абліжаш. Ну, а іншыя дык так мучыліся - крый Божа! Не людзі, а косці, абцягнутыя скурай, парослай мохам. Такія ведалі, іх чакае вогнішча. Лагер яшча быў да канца не дабудаваны. І палілі трупы проста на вуліцы, за ўзведзенай сцяной.

У Майданаку я адмучылася дзевяць месяцаў. Выжыла, бо была маладая, па-сялянску цягавітая. Але кожны дзень пакідаў зарубкі на ўсё жыццё. Колькі гора перажыла і ўбачыла колькі слёз! З многімі дзяўчатамі і жанчынамі зрадніліся, мы былі адна адной як сёстры. І як жудасна было праходзіць каля той страшнай сцяны, ведаючы, што не сёння-заўтра там будзе гарэць нехта з тваіх сяброўак. Або – ты сама... Ці будзеш расстраляна, закатавана. Кожны дзень сеяў смерць.

З набліжэннем фронту фашысты адцягвалі сваіх рабоў у глыб Германіі. Так давялося мне пабываць і ў лагеры Равенсбрук, і ў лагеры пад Лейпцыгам. А неяк прачнуліся майскім ранкам - і не паверылі вачам. Ціха. Нідзе ніводнага фашыста. І ўбачылі сваіх вызваліцеляў - англічан. Якая была радасць! Мелі выбар: ехаць дамоў ці ў Англію. Я не раздумвала. Вядома ж, дамоў. Дарога, праўда, была доўгай. Ішлі пешшу. Але ж то была дарога з няволі да роднага парога. І гэта прыдавала сілы.

Паўвека мінула з таго часу. А з памяці, з душы перажытага не выкінеш. Атрымала вось маркі нямецкія - плату за тыя горкія дні. Толькі не хацела б ні марак, ні той нялюдскай, жудаснай маладосці. Не дай Бог нікому больш такога зведаць.

Запісала Марыя Драпеза, в. Курчоўцы,
2005 год.